# «ЛЯВОНІХА»... НА ІСПЫЦЕ

**Складаным выпрабаваннем для аматараў беларускіх народных танцаў стаў удзел у конкурсе «Ветразь». Гэты ўнікальны конкурс прайшоў у сталічнай сярэдняй школе №168 і стаў важкім укладам у далучэнне школьнікаў і моладзі да нашай багатай нематэрыяльнай спадчыны.**



Выступае гурт «Берагіня» з вёскі Мётча Барысаўскага раёна.

Зазначу адразу: навучальнаму працэсу ў школе зусім не перашкаджалі музыка і спевы, якія той раніцай гучалі ў аддаленай актавай зале. Наадварот, атмасфера конкурснага спаборніцтва адчувалася і натхняла на поспех ва ўсіх вучэбных кабінетах. Перамогі жадалі сваім сябрам не толькі мясцовыя школьнікі. Да перамогі ў конкурсе імкнуліся таксама аматары народнага танца з маладзёжнага гурта «Guda» (Мінск), школьнікі са Слуцкага і Барысаўскага раёнаў.

— Конкурс мы назвалі раённым, — патлумачыў аўтар ідэі і канцэпцыі, навуковы і мастацкі кіраўнік праекта, вядомы беларускі этнахарэограф Мікалай Козенка, — але гэта зусім не азначае, што ўдзельнікамі з'яўляецца толькі моладзь Кастрычніцкага раёна Мінска. Арганізатары спаборніцтва — Беларускі фонд культуры, Белдзяржуніверсітэт культуры і мастацтваў, Цэнтр дадатковай адукацыі «Ветразь» — спадзяваліся прыцягнуць да ўдзелу вядомыя і маладыя калектывы з розных рэгіёнаў. Гэта атрымалася і ўзбагаціла танцавальны фэст мноствам новых мясцовых колераў. Усе выступленні суправаджалі спецыяльна створаныя інструментальныя капэлы, што таксама спрыяла больш яскраваму выкананню народных танцаў.



Журы было строгім і справядлівым.



У віхуры «Лявонісі».

Музыкі нібы падахвочвалі лаўрэатаў конкурсу, танцавальныя пары са школы №168 і імкліва, з запалам выконвалі папулярны ў мінулыя часы танец «Матлёт». Пад «Лявоніху» і «Какетку» танцавалі школьнікі з фальклорнага гурта «Берагіня» (Барысаўскі раён), якія атрымалі спецыяльны прыз сімпатый гледачоў; не адставалі ад іх аднагодкі з вёскі Вясея (Слуцкі раён). Старэйшыя ўдзельнікі, мінскія студэнты, узорна выканалі вясёлы танец «Субота».

Арганізатары і эксперты разам з запрошанымі спецыялістамі абмеркавалі вынікі конкурсу на пасяджэнні «круглага стала». Яны выказалі пажаданне, каб такія творчыя спаборніцтвы адбываліся не толькі ў Мінску, але і ў буйных гарадах, раённых цэнтрах Беларусі.

Дарэчы, з найлепшымі танцавальнымі парамі неўзабаве сустрэнуцца ўдзельнікі і гледачы рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», які адбудзецца у раённым цэнтры Акцябрскі на Гомельшчыне. Пуцёўкі на гэты фестываль яны заваявалі на мінскім конкурсе «Ветразь».

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ